**12-га СНЕЖНЯ—**

**ВЫБАРЫ**

**НАРОДНЫХ СУДДЗЯЎ.**

**УСЕ—НА ВЫБАРЫ!**

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 36 (623) Пятніца, 10 снежня 1965 г. Год выдання XVIII Цана 1 кап.




*Напярэдадні выбараў маладых выбаршчыкаў нашага універсітэта студэнтаў-фізікаў УЛАДЗІМІРА ЧУДАКОВА, УЛАДЗІМІРА КУЗНЯЦОВА, ГЕНАДЗЯ БУСЛАВА, ПЯТРА ПАЛЕШЧУКА можна часта сустрэць каля агітпункта. Хлопцы будуць выбіраць упершыню.*

**6 снежня 1965 года адбыўся Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС.**

**Пленум заслухаў і абмеркаваў даклады намесніка Старшыні Савета Міністраў СССР, старшыні Дзяржплана СССР тав. Н. К. Байбакова «Аб народнагаспадарчым плане СССР на 1966 год» і міністра фінансаў СССР тав. В. Ф. Гарбузава «Аб бюджэце СССР на 1966 год».**

**Пленум абмеркаваў пытанне аб пераўтварэнні органаў партыйна-дзяржаўнага кантролю ў органы народнага кантролю. Па гэтаму пытанню зрабіў паведамленне Першы сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў.**

**Па абмеркаваных пытаннях Пленум прыняў адпаведныя пастановы.**

**Пленум выбраў тав. У. В. Шчарбіцкага кандыдатам у члены Прэзідыума ЦК КПСС.**

**Пленум выбраў тав. І. В. Капітонава сакратаром ЦК КПСС.**

# ВУЧЫЦЦА—НАСТОЙЛІВА ПРАЦАВАЦЬ!

Першая экзаменацыйная сесія! Гэта як бы другі тур уступных экзаменаў ва універсітэт. І вельмі многа залежыць ад таго, як вы, таварышы першакурснікі, асабліва тыя, што прыйшлі да нас на вучобу проста са школы, здасце іх. Вы, відаць, ужо зразумелі, што патрабуецца ад студэнта: «Вучыцца — настойліва працаваць». Але ці навучыліся ўжо вы рацыянальна гэта рабіць?

Трэба ўважліва слухаць лекцыі, актыўна працаваць на ўсіх лабараторных занятках: яны вучаць, як самастойна адкрываць тыя ці іншыя заканамернасці, вывады, якія на лекцыях вы слухаеце па сутнасці пасіўна. І — галоўнае — трэба самім працаваць над кнігай: чытаць, канспектаваць, параўноўваць, удумвацца і проста завучваць, запамінаць. Заўсёды памятайце: лекцыі павінны дапамагчы вам зразумець вузлавыя і найбольш цяжкія пытанні, звязаць прыватныя моманты ў сістэму; лабараторныя заняткі павінны навучыць вас працаваць рукамі, мець мажлівасць убачыць уласнымі вачыма многія працэсы, зразумець іх да канца.

Чытаць толькі падручнікі — мала: па шэрагу раздзелаў яны звычайна адстаюць ад сённяшняга дня навукі. Каб быць у курсе новых дасягненняў, чытайце навукова-папулярную літаратуру, часопісы «Навука і жыццё», «Веды—сіла», «Здароўе», брашуры таварыства «Веды» і іншыя.

Вы навучаецеся ў вну, і гэта вучоба вельмі адрозніваецца ад школьнай. Навучанне ідзе тут комплексна. Лекцыі вы слухаеце ў прафесараў і дацэнтаў. На лабараторных занятках часта размова ідзе, як быццам зусім аб іншым. Трэба быць сканцэнтраваным, добра арганізоўваць выкананне сваіх заданняў, займацца сістэматычна, каб улавіць увесь аб'ём і ўсю сістэму ведаў, якія прапануе вам універсітэт.

Сёння, напрыклад, вывучаць біялогію нельга без паглыблення ў фізіку і хімію, без ведання матэматыкі. Без гэтага не пазнаеш не толькі біяфізікі, але і многіх іншых біялагічных дысцыплін.

Універсітэцкая адукацыя адрозніваецца якраз тым, што дае шырокія магчымасці кожнаму ўвайсці ў навуковую працу, адчуць яе і цяжкасці і асалоду, авалодаць яе прыёмамі і метадамі. Але ведайце, што без працы—штодзённай, напорыстай, не заўсёды захапляльнай, можа, нават і нуднаватай, без яе вялікасці працы стаць сапраўдным спецыялістам вы не зможаце.

На біяфаку ў нас добрыя ўмовы для росту: на ўсіх кафедрах працуюць таленавітыя вучоныя, вядомыя не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой прафесары і акадэмікі: Т. Н. Годнеў, Г. Г. Вінберг, П. Ф. Ракіцкі, Н. В. Турбін, П. А. Буланаў, А. Н. Іпацьеў, Г. С. Юньеў і іншыя.

Таварышы першакурснікі! Непрыемна псаваць добры настрой першых сустрэч, але і нельга прамаўчаць: не будзьце слабахарактарнымі, не бойцеся пайсці супраць ільвывай таварыскасці, калі яна цягне вас у балота абыякавасці да навукі, да важных надзённых спраў.

І асабліва маё слова да студэнтаў-камуністаў: не забывайце, таварышы, аб сваёй авангарднай ролі. І гэта павінен памятаць не толькі камуніст — першакурснік, а і кожны студэнт-камуніст. Быць заўсёды ў авангардзе—ваша задача.

У заключэнне хачу сказаць: зайздрошчу Вам, Вы—на пачатку дарог, і якімі яны будуць, усё залежыць ад Вас. Вы шчаслівыя!..

Е. П. КЕСАРАВА,
доктар, прафесар, сакратар партбюро біяфака.

# КАЛІ ЗВІНІЦЬ АПОШНІ ЗВАНОК

Сёння на гістарычным факультэце гавораць аб дзвюх падзеях. Асабліва шмат аб першай. Пяцікурснікі, яны падрыхтавалі канцэрт мастацкай самадзейнасці, і выступілі з ім у дзень, калі студэнцкі званок празвінеў для іх у апошні раз.

На сцэне гучалі песні. Іх выконвалі Кіра Ліпская, Алег Мярцвішчаў, Уладзімір Навіцкі і Жэня Зінкевіч. А колькі было прачытана вершаў! Ды вось на сцэне Анатоль Збрыцкі і Міша Маргішвілі выканалі матроскае «Яблычка». Цёпла сустрэлі ў зале і студэнцкія інтэрмедыі. Пад гром воплескаў першакурснікі падносілі сваім старэйшым калегам кветкі.

З незабыўнымі словамі звярнуўся да выпускнікоў дэкан факультэта П. З. Савачкін:

— Хутка настане для вас той доўгачаканы дзень, калі вы як маладыя спецыялісты зробіце свае першыя самастойныя крокі ў жыццё. Яно цяпер будзе для вас экзаменатарам. І мне хочаца, каб поспехі ў вас былі заўсёды добрыя...

А яшчэ на гістарычным факультэце пачалася экзаменацыйная сесія. І зноў гэта датычыцца студэнтаў-пяцікурснікаў: яны першымі адкрылі зімнюю сесію на факультэце і маюць на сваім ліку ўжо два здадзеныя экзамены. Першыя іх поспехі радуюць і выкладчыкаў і студэнтаў. Тут няма ніводнай «нездавальняючай». Н. Тамашэвіч, Л. Шохан, Л. Мусіч здалі абодва экзамены на «выдатна».

Ідуць у шэрагу першых і многія іншыя студэнты групы. Ля дзвярэй, як спаконвеку, балельшчыкі. Экзамен самы сур'ёзны — асновы дзяржаўнага права.

Валя Бялявіна — расхваляваная.

— Ну, як? Здала?

Дзяўчаты і хлопцы зазіраюць у заліковую кніжку. Буйнымі, акуратнымі літарамі выведзенае «выдатна» вырывае з іх грудзей гул захаплення.

Наперадзе ў пяцікурснікаў — дыпломныя работы. Мы зробім усё, каб напісаць іх, як найлепш.

**Я. БАРАНОЎСКІ,
студэнт V курса гістарычнага факультэта.**



Да паслуг студэнтаў біяфака—багаты заалагічны музей.

## СПРЭЧКА ІДЗЕ



*Хведар Калеснікоўіч*
*(І-шы курс, філфак).*

**— Выдумалі вы свайго Віталія В., а Іван — нейкая недарэчнасць, калі сам пра сябе такое гаворыць!..**



*Аляксандр Сцефановіч*
*(аспірант).*

**— Гутарку пра двойку і тройку трэба весці. У аспірантуры, калі ты атрымаеш тройку па спецыяльнаму прадмету — проста механічна з яе выбываеш. Тройка па спецдысцыпліне!! Які ж ты спецыяліст!! А ці ж не спецыяльныя дысцыпліны вывучае студэнт. Тройку, я лічу, яшчэ горшай ацэнкай, чым двойка. Студэнт застаецца студэнтам, але падрыхтаванасць троечніка да працоўнай дзейнасці благая.**



*Мікалай Гальчанюк*
*(ІІ-гі курс, гістфак).*

**— Вы крытыкуеце студэнтаў за тройкі. А ці падлічылі, колькі часу студэнты маюць на падрыхтоўку да экзаменаў. Мы вельмі загружаны: лекцыі, семінары, грамадская работа. Праблема тройкі — гэта праблема даць студэнту больш вольнага часу, больш давяраць яму самому і даваць частку матэрыялу для самастойнай апрацоўкі. На лекцыях нам часта разжоўваюць вядомыя ісціны, у якіх няцяжка разабрацца без лектара. Час на гэта траціцца, а выйгрыш нязначны. Студэнт павінен зразумець, што яго першы абавязак — вучоба. Калі ён сам сябе не будзе трымаць у дысцыпліне, не будзе адчуваць адказнасці за свае поспехі — ніякая крытыка, ніякія куратары яму не дапамогуць.**

# ЗІМА КЛІЧА!

У гэтым годзе 270 студэнтаў і супрацоўнікаў нашага універсітэта адпачывала ў спартыўна-аздараўленчым лагеры на возеры Нарач. Сонца, вада былі іх неразлучнымі сябрамі. 230 студэнтаў прайшлі ў турысцкіх паходах па маршрутах Салігорск, Гомель, Гродна, Мазыр, Белавежская пушча, Брэсцкая крэпасць, Каўказ, Крым.

Усё гэта было летам.

Непрыкметна падкралася зіма з яе люстраным катком, рыпучым пад лыжамі снегам. Ці паменшыліся маршруты адпачынку нашых студэнтаў і супрацоўнікаў цяпер?.. Не! Наадварот — іх пабольшала!..

Амаль кожную раніцу ў нядзелю электрычкі і аўтобусы вывозяць за горад малады народ у цёплых світэрах, з лыжамі на плячах. Іх чакае заснежаны лес, новая лыжня. Снег любяць усе: і маладыя і больш сталыя. Таму ўжо цяпер мясцком нашага універсітэта плануе шматлікія аднадзённыя зімовыя пуцёўкі на турбазы. Намечана за 8 паездак забяспечыць 320 чалавек. Частка супрацоўнікаў нашага універсітэта ўжо адпачывала на турбазе «Беларусь». Дзень, праведзены сярод снежнай цішыні, кліча іх зноў на ўлонне зімы.

Усяго 2315 студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта было ў паходах летам. Зіма абяцае гэтую лічбу ці не падвоіць. Абяцаюць зіма, любоў да снегу, мясцком і прафком.

**С. САЗОНАВА,**
**студэнтка другога курса аддзялення журналістыкі.**



*Студэнты нашага універсітэта на лыжнай прагулцы.* *Фота: А. Кадзета.*

## АБ ШЧАСЦІ, ДАБРЫ, АБАВЯЗКУ

*Кнігі твайго выкладчыка, студэнт!*

Даследаванню пытанняў камуністычнай маралі, распрацоўцы тэарэтычных і практычных асноў выхавання ў сучасных умовах прысвечана кніга «Асновы марксісцка-ленінскай этыкі». Падрыхтаваная калектывам аўтараў, большасць якіх — супрацоўнікі нашага універсітэта — яна нядаўна выйшла ў выдавецтве «Вышэйшая школа».

У кнізе падрабязна гаворыцца аб узнікненні чалавечай маралі, заканамернасцях яе развіцця і сувязях з грамадска-эканамічнымі адносінамі. Асабліва шмат месца займае ў ёй выяўленне сутнасці і зместу катэгорый марксісцка-ленінскай этыкі, — такіх, як дабро, справядлівасць, абавязак, гонар і пачуццё уласнай годнасці, сумленне, шчасце.

Аўтары справядліва адзначаюць, што гістарычнае развіццё грамадства непазбежна прыводзіць да вышэйшай ступені — камуністычнай маралі, якая ўбірае ў сябе ўсе лепшыя дасягненні духоўнай культуры чалавецтва.

Шматлікімі прыкладамі аўтары ілюструюць дзейснасць камуністычнай маралі, яе перавагу над капіталістычнай.

У гэтай сувязі рэзка крытыкуюцца сучасныя буржуазныя этычныя сістэмы неапазітывізму, прагматызму, экзістэнцыялізму, неатамізму і іншыя.

У цэлым даследаванне — каштоўны ўклад у распрацоўку праблем марксісцка-ленінскай этыкі. Яно, безумоўна, з'явіцца карысным дапаможнікам для студэнтаў, якія вывучаюць асновы марксісцка-ленінскай этыкі.

**П. ФУРС,**
**аспірант кафедры гісторыі, філасофіі, логікі, этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму.**

## ДАСЛЕДУЕЦЦА ПРАВАПІС

У гэтым годзе выдавецтва «Вышэйшая школа» выдала «Беларускі правапіс».

Сваё даследаванне Я. М. Камароўскі робіць у параўнальна-гістарычным плане. Злабадзённыя пытанні беларускай арфаграфіі разглядаюцца на сучасным матэрыяле ў параўнанні з моўнымі фактамі мінулых стагоддзяў і іншых славянскіх моў, дадзенымі сучаснай дыялекталогіі.

У рабоце асвятляюцца некаторыя праблемы гістарычнага фарміравання і развіцця сучаснай арфаграфічнай сістэмы і графікі. Даецца аналіз і ацэнка важнейшых правіл сучаснай беларускай арфаграфіі. Аўтарам выказваюцца слушныя рэкамендацыі па ўдасканаленню многіх правіл напісання і літаратурнага вымаўлення.

Даследчык падрабязна спыняецца на пытанні ўпарадкавання правапісу слоў беларускай мовы іншаземнага паходжання, складаных слоў і некаторых граматычных форм. Навуковае асвятленне гэтых пытанняў прынясе бясспрэчную карысць беларускаму правапісу.

Праца «Беларускі правапіс» будзе цікавая студэнтам-філолагам, настаўнікам, работнікам друку, радыё і тэлебачання.

**А. ЛЯПІЧ,**
**лабарант.**

## *Не наш тыпаж*

...«За акадэмічную непаспяховасць і неахайныя адносіны да універсітэцкай маёмасці выключыць з універсітэта студэнтку другога курса фізічнага факультэта Марыю Бібу...» Гэта выпіска з загаду рэктара універсітэта А. Н. Сеўчанкі, калі можна так сказаць, постскрыптум. Але што ж папярэднічала гэтаму сумнаму постскрыптуму?

Біба брала ў чытальні падручнікі. Брала, як усе, але вяртала—не як усе. Выдзера жмут старонак, і ўжо задзёршы нос, чэша здаваць. Праўда, шпаргалкі не заўсёды дапамагалі, бо двойкі перападалі ў Бібы густа. Ды яе «аперацыі» над падручнікамі да пары да часу з рук ёй сыходзілі. Сумны постскрыптум гэтай гісторыі—толькі яшчэ адно са сведчанняў, як



уся грамадскасць нашага універсітэта адносіцца да гультайства і недобрасумленнасці.

## БОЛЬШ БЫ ТАКІХ СУСТРЭЧ!

Тое, што адбылося ў гэты вечар у адной з аўдыторый гуманітарнага корпуса,—не нагадвала ні лекцыі, ні семінарскіх заняткаў. Ішла зусім не рэгламентаваная і разам з тым сур'ёзная і цікавая размова аб прафесіі журналіста, аб нарысе як важнейшым жанры публіцыстыкі.

На сустрэчу са студэнтамі 4 і 5 курсаў аддзялення журналістыкі прыйшлі Аляксей Кулакоўскі, Ігнат Дуброўскі, Уладзімір Юрэвіч. Яны не давалі «гатовых рацэптаў», а дзяліліся сваім багатым вопытам, адказвалі на шматлікія пытанні.

Ад імя кафедры тэорыі і практыкі партыйна-савецкай журналістыкі мне хочацца падзякаваць пісьменнікам-публіцыстам за карысныя парады маладым журналістам.

**Е. БОНДАРАВА,**
**дацэнт кафедры тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку.**

## УСМЕШКІ НАШЫХ СЯБРОЎ

*Сакрат: — Я ведаю, што я нічога не ведаю.*
*Выкладчык: — Гэта мне гаворыць кожны студэнт.*

* * *

*Выкладчык: — На экзаменах, бы ў тэатры. Вы выконваеце ролю артыста, я — гледача.*
*Студэнт: — цудоўна, тады я пазаву суфлёра.*

* * *

*— Ты чаго на лекцыю не прыйшоў?*
*— Дзівак, я на іх зусім не хаджу.*
*— А як жа стараста?*
*— Ён таксама не ходзіць.*

* * *

*Як бы ён ні быў завалены працай, яму заўсёды ўдавалася разваліць яе.*

* * *

*— Слава богу, здаў!..— сказаў студэнт пасля заліку па атэізму.*

*(«Кішынёўскі універсітэт» за 16 кастрычніка 1965 г.).*

**Рэдактар А. ЛОЙКА.**

АТ 03575 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, БДУ імя Ул. І. Леніна, галоўны корпус, п. 212, тэл. 2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 1338.